УДК 821.161.3-31:7.01«1986/1999»

# Раманная серыя як эстэтычны феномен у беларускай прозе апошняй трэці XX стагоддзя

**Навасельцава Г.В.**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава», Віцебск*

*Цыклізацыя рамана выступае адметнай эстэтычнай з'явай у беларускай прозе другой паловы XX стагоддзя. Прыклады раманнай серыі прадстаўлены ў творчасці Вячаслава Адамчыка, Івана Чыгрынава. Вышэйсказанае прадвызначае мэту даследавання – ахарактарызаваць раманную серыю як эстэтычны феномен у беларускай прозе апошняй трэці XX стагоддзя.*

***Матэрыял і метады.*** *Для вывучэння праблемна-тэматычнай і жанрава-стылёвай спецыфікі раманаў «Шчыглы», «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа», «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян», «Палыновы вецер» Леаніда Левановіча быў выкарыстаны комплексны аналіз, які ўключае культурна-гістарычны, структурна-тыпалагічны метады з элементамі кампаратывістыкі.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Пісьменнік раскрывае сямейную гісторыю на працягу значнага адрэзку часу, увасабляе аўтабіяграфічны вобраз скразнога персанажа, шырока выкарыстоўвае традыцыю сямейнай хронікі. Аповед, хоць найчасцей і вядзецца ад трэцяй асобы, у гэтым выпадку блізкі «Я»-апавядальнай стратэгіі, якая дазваляе актуалізаваць розныя сродкі мастацкага псіхалагізму.*

***Заключэнне.*** *У творчасці пісьменніка цыклізацыя рамана не выступае паўнавартаснай эстэтычнай з'явай, перавага аддаецца найперш раманнай серыі, якая дазваляе мастаку слова вар'іраваць тэмы і праблемы.*

***Ключавыя словы:*** *раман, жанр, беларуская проза, Леанід Левановіч, цыклізацыя, феномен.*

*(Ученые записки. – 2019. – Том 29. – С. 168–173)*

# Novel Series as an Aesthetic Phenomenon in the Belaruisan Prose of the Last Third of the 20th Century

**Navaseltsava G.V.**
*Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*Cyclization of the novel is a distinctive aesthetic phenomenon in he Belarusian prose of the second half of the twentieth century. Examples of the novel series are presented in the works of Vyacheslav Adamchik and Ivan Chigrinov. The above predetermines the purpose of the study which is to characterize the novel series as an aesthetic phenomenon in Belarusian prose of the last third of the twentieth century.*

***Material and methods.*** *To explore the problem-thematic, genre and stylistic specifics of the novels "Goldfinches", "Flooding in Winter", "Wild Rose", "Blue Summer", "Besed Flowing into the Ocean", "Malinovy Wind" by Leonid Levanovich a comprehensive analysis that includes cultural, historical, structural-typological methods with elements comparativistic was used.*

***Findings and their discussion.*** *The writer reveals a family history for a significant period of time, embodies the autobiographical image of the through character, widely uses the tradition of family Chronicles. The story, although most often conducted from a third person, in this case is close to the "I"-the narrative strategy that allows you to update various means of artistic psychology.*

***Conclusion.*** *In the work of the writer cyclization of the novel is not a full-fledged aesthetic phenomenon, the advantage is given primarily to the novel series, which allows the artist to vary the themes and problems.*

***Key words:*** *novel, genre, Belarusian prose, Leonid Levonovich, cyclization, phenomenon.*

*(Scientific notes. – 2019. – Vol. 29. – P. 168–173)*

---

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: Novoseltseva.anna@mail.ru* – ***Г.В. Навасельцава***

Цыклізацыя рамана, як вядома, адкрывае магчымасці для апрабацыі новых эстэтычных мажлівасцяў жанру. У беларускай прозе раманныя серыі прадстаўлены ў творчасці Вячаслава Адамчыка, Івана Чыгрынава. Захоўваючы фармальныя прыкметы эпічнага палатна, мастакі слова звяртаюцца да суб'ектыўнай інтэрпрэтацыі, узнаўлення «Я»-апавядальнай сітуацыі, выкарыстання розных прыёмаў сімваліка-алегарычнага пісьма, этнаграфічнага матэрыялу і этнаграфічнага кантэксту. Пісьменнікі імкнуцца раскрыць храналогію падзей не столькі праз цэнтрабежную, колькі цэнтраімклівую вобразную арганізацыю, хоць мастацкі псіхалагізм выкарыстоўваецца для раскрыцця пераважна статычных вобразаў. Як доказна сцвярджае Л. Корань, раманы Вячаслава Адамчыка, Івана Чыгрынава раскрываюць шляхі фарміравання эпічнай традыцыі ў беларускай літаратуры, але разам з тым сэнсава знакавымі для кожнай раманнай серыі выступаюць менавіта заключныя творы, якія паказальна ілюструюць і такую эстэтычную тэндэнцыю, як інтэлектуалізацыя беларускай прозы [1].

Адметная раманная серыя прадстаўлена ў творчасці Леаніда Левановіча, якога літаратурныя крытыкі называюць летапісцам Прыбяседдзя. У партрэтнай замалёўцы, прысвечанай мастаку слова, Расціслаў Бензярук звяртае ўвагу на аўтабіяграфічнасць многіх старонак раманаў «Прыдняпроўскай хронікі», як вызначае крытык цыкл аўтарскіх твораў. І «няхай сабе ягоныя Клеявічы сталі Хатынічамі, а галоўны герой – Андрэем Сахутам, але ў ім угадваецца сам аўтар» [2]. Пры гэтым, працягвае крытык, Леанід Левановіч разумеў, што ставарае не дакументальнае, а мастацкае, а значыць, мае поўнае права на вымысел і домысел. У творах Леаніда Левановіча «бачацца рысы станаўлення новага беларускага рамана, арыентаванага на сацыяльна дзейны сінтэз нацыянальнага і агульнаеўрапейскага духоўнага вопыту» [3, с. 571]. Пісьменнік паказвае сваіх герояў неад'емна ад значных сацыяльных і гістарычных варункаў, асэнсоўвае грамадскі вопыт праз індывідуальнае бачанне свету, у чым і выяўляецца традыцыйная эпічнасць раманных тэкстаў. Разам з тым у кожным з твораў раманнай серыі вузкаакрэсленыя храналагічныя каардынаты, шырока выкарыстоўваюцца часавыя рэтраспекцыі, аўтар імкнецца да лаканічнай апавядальнасці, звяртаецца да эфекту публіцыстычнага ўздзеяння. Вышэйсказанае прадвызначае мэту даследавання – ахарактарызаваць раманную серыю як эстэтычны феномен у беларускай прозе апошняй трэці ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** З дапамогай комплекснага аналізу, які ўключае культурна-гістарычны, структурна-тыпалагічны метады з элементамі кампаратывістыкі, вывучаецца раманная серыя як эстэтычны феномен у беларускай прозе апошняй трэці ХХ стагоддзя. Аб'ектам даследавання выступаюць раманы «Шчыглы», «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа», «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян», «Палыновы вецер» Леаніда Левановіча. Прадметам даследавання абрана праблемна-тэматычная і жанрава-стылёвая спецыфіка гэтых твораў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Раман «Шчыглы» (1986) Леаніда Левановіча адкрывае серыю твораў, у якой распавядаецца гісторыя сям'і Сахутаў, іх аднавяскоўцаў на фоне грамадскіх зрухаў свайго часу. Мясцовыя падзеі ад вызвалення Прыбяседдзя да першага пасляваеннага лета знаходзяцца ў цэнтры ўвагі аўтара ў мастацкім палатне, дзе галоўным сузіральнікам выбраны шасцігадовы Андрэйка. Непасрэднасць дзіцячага светабачання адцяняе трагічную рэчаіснасць, у прыватнасці, з гаворкі дарослых хлопчык даведваецца, што «ідзе блакада. Немец усё паліць. Нішчыць падчыстую. Людзей забівае» [4, с. 14]. Андрэйка ведае, што старэйшая сястра Марына хаваецца ад немцаў у жыце, марыць хутчэй стаць вялікім і пастраляць з аўтамата ўсіх ворагаў. Пісьменнікам паслядоўна паказваецца, як малы чуе стрэлы з «кацюшы» і палохаецца іх, разам са старэйшымі хаваецца ў лесе, вяртаецца ў спаленую вёску: «Ён нічога не пазнаваў, бо вёскі не было, стаялі абкураныя печы з разбуранымі камінамі, чорныя абгарэлыя дрэвы. Можа, таму, што печы і дрэвы былі чорныя, твары людзей сумныя, Андрэйку ўсё здавалася чорным: і лес, і поле, і неба з бухматымі восеньскімі хмарамі» [4, с. 24]. Хоць аповед фармальна вядзецца ад трэцяй асобы, тым не менш тыпалагічна блізка «Я»-апавядальнай стратэгіі ўзнаўляецца ўнутраны свет дзіцяці, паслядоўна выкарыстоўваюцца мастацкі псіхалагізм і аўтабіяграфізм. Так, хлопчык прагна чакае вяртання бацькі, якога амаль не памятае, перажывае нішчымніцу і голад, бачыць хараство навакольнага свету. Знакава, што каля спаленай хаты сям'я нечакана знаходзіць квактуху з куранятамі, якія невядома як маглі ацалець, і чытач асацыятыўна супастаўляе іх з Андрэйкам і яго братамі.

На іншасказальным узроўні Леанід Левановіч раскрывае вобраз шчыглоў – дзяцей, чыё маленства апалена вайной, але гэта не змагло адабраць у іх радасці, светлых уяўленняў і мар. Траге-

дыя часу заключаецца ў тым, што вайна забірала жыццё не толькі ў дарослых, і аўтар спрабуе гэта асэнсаваць з гуманістычнай пазіцыі. Памірае ад менінгіту (не было патрэбных лекаў) Андрэйкаў брацік Коля, які, ужо цяжка хворы, разважае зусім не па-дзіцячы, хоча суцешыць маці: «Не плач, мама… Вунь салдат колькі загінула… Ніхто не плакаў… Калі я памру, каб вы не плакалі… Жэўжык за мяне будзе ў школу хадзіць…» [5, с. 85]. Рана сталее і чулы Андрэйка, якому на ўсё жыццё застаецца цяжкая памяць.

У рамане шырока выкарыстоўваецца і аповед ад трэцяй асобы, у выніку чаго аўтар сцісла паведамляе пра асноўныя жыццёвыя перыпетыі розных герояў, звязвае гэта з вясковымі падзеямі. Дзякуючы выпадковаму чалавечаму спачуванню і сваёй прафесіі не быў мабілізаваны настаўнік Пётр Мамута, які вучыць дзяцей чытаць і пісаць, не маючы для сваіх вучняў ні кніг, ні сшыткаў, ні алоўкаў. Герой кантрастуе з Паўлам Крупадзёравым, які да вайны працаваў намеснікам упаўнаважанага па нарыхтоўках, вяртаецца з эвакуацыі і сваімі паводзінамі, як і раней, адпавядае ўласнаму прозвішчу. Скалечаны капітан-артылерыст Міхась Даўгалёў становіцца старшынёй раённай планавай камісіі, старанна асвойвае новы для яго род заняткаў, сутыкаецца з тым, што трэба выконваць план, напрыклад, лесанарыхтовак, а працаўнікоў у вёсках засталося надзвычай мала. Становіцца ўчастковым былы партызан Валодзька Бравусаў, які не жадае цяжка працаваць, як гэта робяць калгаснікі, да таго ж ужо адчуў слодыч улады над людзьмі, яму прыемна, калі яго баяцца і слухаюць. Гэтыя і іншыя персанажы падаюцца чытачу праз сціслыя аўтарскія характарыстыкі, якія не ствараюць псіхалагічна глыбокіх партрэтаў. Леанід Леановіч перадае каларыт таго часу, стварае адметную вобразную сістэму, звяртаецца да дэталёвага апісання рэчаіснасці.

Увагай да грамадскай атмасферы, зваротам да яе вобразнага даследавання вызначаецца раман «Паводка сярод зімы» (1983–1987), у якім працягваецца апісанне сямейнай гісторыі Сахутаў. Па-ранейшаму сярод іншых персанажаў прыкметна вылучаецца Андрэй Сахута, які ўжо стаў школьнікам. Герой паказваецца не толькі ва ўзаемаадносінах з родзічамі, але і ў актыўным пазнанні акаляючага свету, дзе ўсё больш складана, чым здаецца на першы погляд. Напрыклад, вялікай радасцю для хлопчыка становяцца доўгачаканыя новыя бацінкі, на якія нават звяртае ўвагу настаўніца, гаворыць дзецям, што ім таксама бацькі набудуць новы абутак, калі будзе добрая вучоба. Аднак «у Андрэйкі ледзь не сарвалася з языка, што бацінкі купіла сястра Марына, а бацьку ў калгасе грошай не плоцяць, яму толькі працадні запісваюць – палачкі ставяць» [6, с. 11]. Вырашае хлопчык і больш важкія пытанні, у прыватнасці, якім будуць яго адносіны да «Нінкі-паліцайкі», дачкі паліцая Вароніна, які ўцёк з немцамі. Да дзяўчынкі дрэнна адносяцца іншыя дзеці з-за вядомых у вёсцы бацькавых спраў, на якія не можа забыцца заснаваная на спрадвечнай этыцы, пільная да ўсяго добрага і злога сялянская памяць. Паступова Андрэйка прыходзіць да разумення, што малая дачка не можа несці адказнасць за бацьку, нядобра за ўчынкі аднаго чалавека караць іншага.

Пісьменнік завастрае праблему памяці, якую паказальна асэнсоўвае праз вобраз маці. У некалькіх раманах Леаніда Леановіча эмацыйна шматзначна ўвасабляецца, як Кацярына Сахута чакае вяртання старэйшага сына, не верыць у тое, што прапаў без вестак. Застаецца незамужняй старэйшая Андрэйкава сястра Марына, пра якую кажуць, што яе жаніх загінуў на вайне. Аўтар іншасказальна выказвае думку, што ўсім балюча смыляць раны, пакінутыя вайной. Але, як прызнаецца сам аўтар, людзі напалову спаленай вёскі Хатынічы спяшаліся радавацца, спявалі песні, весяліліся, імкнуліся дабраць тое, чаго не мелі за доўгія гады вайны. Гэта і вызначае ідэйную скіраванасць рамана «Паводка сярод зімы», у фінале якога сэнсавапаказальна апісваецца вяселле і зазначаецца, што «над Мамонаўкай-Парцюкоўкай звінелі песні, нястомна заліваўся гармонік, радасна і гулка грымеў самаробны бубен» [6, с. 314].

У творы нямала прысвечана паказу вялікай стваральнай працы, якая вядзецца прадстаўнікамі мясцовай савецкай улады, партыйнымі кіраўнікамі. Выключэннем становіцца эпізадычны выпадак, калі на лаве падсудных апынуўся Крупадзёраў, які адчуў усёдазволенасць і, хоць сам не паспытаў нястачы, папаўся на камерцыйнай аферы. Прага грошаў ва ўмовах, калі пераважная большасць людзей апынулася на мяжы выжывання, асэнсоўваецца як маральнае злачынства. Цяжкае матэрыяльнае становішча стала заканамерным наступствам вялікіх ваенных страт, і гэта справядліва як для Хатынічаў, Мамонаўкі, паказаных аўтарам, так і для многіх беларускіх вёсак.

Часавыя каардынаты рамана «Дзікая ружа» (1987–1999) выразна акрэсліваюцца з дапамогай хранікальных звестак з БЕЛТА і ТАСС, якія датуюцца сакавіком-жніўнем 1953 года, гэты ж прыём мэтаскіравана выкарыстоўваецца ў іншых рама-

нах пісьменніка. За гэты час многія героі перажываюць важныя жыццёвыя перыпетыі, абумоўленыя ў тым ліку духоўнымі зрухамі ў грамадстве. Яшчэ ў рамане «Паводка сярод зімы» вуснамі Андрэйкавага дзядзькі Парфіра, афіцэра-франтавіка, выказваецца надзвычай смелая для таго часу думка, што, калі б Сталін не пасадзіў як ворагаў народа многіх вядомых камандзіраў, вайны магло і не быць. Яго не спяшаюцца падтрымаць Андрэйкавы бацькі, хоць і наракаюць на цяжкія падаткі, а сам хлопчык ужо шчыра перакананы ў вышэйшасці і непагрэшнасці бацькі народаў, што выразна ілюструе стан грамадскага мыслення.

Невыпадкова весткай пра смерць Сталіна пачынаецца раман «Дзікая ружа» Леаніда Левановіча, дзе прадметам мастацкага даследавання выступае не столькі вясковае жыццё, колькі светапоглядныя змены, якія закранаюць і людзей з вясковага грамадства. Героем, які ацэньвае тыповыя і нетыповыя рэаліі, выступае школьнік Андрэй Сахута, ён прываблівае чытача юнацкай шчырасцю і яшчэ дзіцячай чуйнасцю і ўражлівасцю. Праз яго ўспрыманне паказальна раскрываюцца паводзіны іншых герояў, калі здараецца гэты паваротны момант у савецкай гісторыі: «Даўкі камяк падкаціў да горла Андрэйкі, ён трымаўся, каб не заплакаць, бо вельмі шкода было Марыі Дзямідаўны, шкада вялікага правадыра. Раз гэтак шкадуе Сталіна, нібы роднага бацьку, настаўніца, а яна ж была ў партызанах, яе мужа павесілі немцы, бачыла гора і ліха, – значыць, усё праўда, што пісалі газеты пра сталінскую мудрасць і веліч, пра клапатлівасць і дабрыню. А тое, што плявузгае дзядзька Парфір пра нейкую жорсткасць бацькі, друга і настаўніка ўсіх народаў – гэта плёткі варожыя» [7, с. 5]. Нягледзячы на юны ўзрост, Андрэй выступае ў творы своеасаблівым маральным аўтарытэтам, да якога звяртаюцца з пытаннямі больш сталыя героі, што неспадзявана апынуліся на раздарожжы. Напрыклад, міліцыянер Бравусаў, які быў на фронце і ўпэўнены, што без Сталіна не перамаглі б, сумняваецца: «Ёсць такая песня. “Смело мы в бой пойдем за власть Советов и как один умрём в борьбе за это…” Дык вось нeяк задумаўся я. Калі ўсе ўмром за ету ўласць, дык для каго ж яна?» [7, с. 16]. Задумваецца над гэтым пытаннем і Андрэй, якому перададзена шмат з аўтарскага светабачання.

Леанідам Левановічам праўдзіва перадаецца грамадская атмасфера першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, удала выкарыстоўваецца шэраг паказальных дэталяў. Той жа Андрэй Сахута, уступіўшы ў камсамол, старанна выконвае першае даручэнне: робіць даклад пра важнасць класавай пільнасці. У новых грамадскіх умовах адметна раскрываецца жыццёвая трагедыя Рамана Свідэрскага, які прайшоў дзве вайны і які заканчвае жыццё самагубствам. Герой не пазбаўлены рыс індывідуальнасці, аднак выступае найперш сацыяльным тыпам: увасабляе мясцовага кіраўніка, які звыкся не лічыцца з вяскоўцамі і ў адносінах з людзьмі схільны да жорсткасці. Пасля таго, як агульны парадак змяніўся, Свідэрскі сутыкаецца з варожасцю сваіх аднавяскоўцаў, напружваюцца сямейныя адносіны, чаго герой аказаўся няздольны вытрымаць.

У рамане з паэтычнай назвай «Сіняе лета» (1994–1997) Леанід Левановіч працягвае жыццяпіс свайго скразнога героя Андрэя Сахуты, у рамантычна-ўзвышаных фарбах паказвае яго маладосць, сяброўства і каханне. Узмацняецца эмацыйнасць аповяду ад імя Андрэя, які чуйна трымае повязь з малой радзімай, паспяхова выконвае абавязкі сакратара ў камсамоле, стварае ўласную сям’ю. Пісьменнік арыгінальна працуе з дэталямі, напрыклад, падрабязна апісвае камсамольскае вяселле, якое мелася стаць новай традыцыяй у савецкім грамадстве. Бачанне савецкай рэчаіснасці вачыма маладога чалавека, поўнага надзей, дапаўняецца аўтарскай ацэнкай, якая даецца з вышыні часу. Пры гэтым Леанід Левановіч звяртаецца да асоб вядомых дзяржаўных дзеячаў, у прыватнасці, Мікіты Сяргеевіча Хрушчова.

Пра час так званай «хрушчоўскай адлігі» аўтар зазначае, што ўсе нарады, пасяджэнні, пленумы былі пашыраныя, а сам кіраўнік дзяржавы любіў выступаць пасля замежнай паездкі нават на гарадскім пляцы. Як іранічна заўважае мастак слова, «паслухаць яго сыходзіліся тысячы людзей – дакладней, іх зганялі на плошчу партыйныя кіраўнікі. Даўжэзныя, эмацыйныя прамовы, падчас якіх Мікіта Сяргеевіч любіў і кузькіну маці ўспомніць, перадаваліся на ўсю краіну. На пленумах і нарадах Хрушчоў часцяком паказваў вялізныя пачаткі-кіёўкі: важкі аргумент, што кукуруза – гэта сала, мяса і малако» [8, с. 33]. Нягледзячы на адыёзныя паводзіны, тагачасны кіраўнік савецкай дзяржавы робіць шмат слушнага, напрыклад, праводзіць палітыку амаладжвання партыйных кадраў. Дзякуючы гэтай палітыцы да ўлады ў БССР прыходзіць такі прагрэсіўны дзеяч, як Пётр Міронавіч Машэраў, эпізадычны вобраз якога паказаны з вялікай аўтарскай сімпатыяй. Разам з тым Леанід Левановіч катэгарычны і строгі ў ацэнцы палітычных учынкаў Мікіты Хрушчова, якога папракае за бязлітаснае выкрыццё культу асобы, што не лепшым чынам

закранула і ваенную памяць. Пісьменнік даводзіць, апелюючы да такой важкай катэгорыі, як духоўнасць, што гэта і стала прычынай не толькі краху палітычнай кар’еры самога Хрушчова, але і пачаткам заняпаду магутнай савецкай краіны.

Пераканаўча перадаецца атмасфера ідэалагічнага супрацьстаяння савецкай дзяржавы і заходняга свету. Напрыклад, як грандыёзная падзея ўспрымаецца палёт Юрыя Гагарына ў космас, вітаецца ўсімі савецкімі грамадзянамі. Камуністы і партыйныя кіраўнікі, у тым ліку героі рамана, сярод якіх Даўгалёў, Ніна Гаўрылюк, успрымаюць гэту з’яву найперш як навуковую перамогу над іншымі краінамі. Паказальна разважае Ніна, якая ўзначальвае аддзел прапаганды ЦК: маўляў, хоць мы, савецкія людзі, ходзім яшчэ ў бахілах і фуфайках, але апярэдзілі іх, значыць, наша навука і тэхніка лепшыя ў свеце. Пры гэтым праблемныя моманты жыцця савецкіх грамадзян усялякім чынам нівеліруюцца. Аўтар з вышыні часу бачыць, што ў савецкім грамадстве існавала шмат недахопаў, і як адзін з галоўных вызначае праблему выбару ў мясцовыя партыйныя органы, з чым звязвае і нацыянальнае пытанне: «Народ не выбіраў іх вяршыць ягоны лёс – іх выбіралі вузкакалейныя закрытыя пленумы <…> Лічылася, што рабочай мовай партыйных органаў павінна быць руская мова. Нібыта сваёй, беларускай, нельга выказаць высокую думку, сфармуляваць партыйную ўстаноўку. Ды і таварышы з Масквы могуць не зразумець…» [8, с. 34]. Такім чынам, у рамане «Сіняе лета», ідэйная ўстаноўка якога – паказаць жыццё маладога чалавека ў савецкім грамадстве, значна акцэнтуюцца грамадска-палітычныя складнікі.

У творы «Бесядзь цячэ ў акіян» (2003) працягваецца хранікальны выклад сямейнай гісторыі. Эпізадычна згадваецца, што памёр ад інсульту саракапяцігадовы Васіль Сахута, старэйшы брат Андрэя. Паказаны мудрым селянінам іх бацька Мацвей, які не бачыць жыцця ў вёсцы без каровы і па-ранейшаму займаецца калгаснай стагоўкай. Праз яго разважанні аўтар нагадвае чытачу, што з васьмярых дзяцей засталіся толькі старэйшая дачка Марына і малодшы сын Андрэй, «астатніх, нібы бязлітаснай касою, выкасілі вайна ды жыццёвыя нягоды» [9, с. 14]. Такім чынам пісьменнік імкнецца зрабіць філасофскія абагульненні пра зменлівасць часу, яго вялікі ўплыў на жыццёвыя абставіны, што на ідэйным узроўні закладзена ў назве рамана.

Леанід Левановіч па-ранейшаму паказвае на першым плане вобраз Андрэя Сахуты, аўтабіяграфічнага скразнога героя. Андрэй акружаны сямейным дабрабытам, бацька ўжо дваіх дзяцей, і паспяхова рухаецца па кар’ернай лесвіцы, становіцца першым сакратаром райкома партыі. Пісьменнік рэтраспектыўна прасочвае жыццёвыя гісторыі яго школьных сяброў, якія толькі эпізадычна згадваліся ў ранейшых творах. Гэта Пятро Махавікоў, што быў лётчыкам і першы раз няўдала ажаніўся, набыў прафесію агранома і стаў рэдактарам на Беларускім тэлебачанні, а пасля знаходзіць сваё сямейнае шчасце.

Рэпрэзентатыўна ўвасабляюць духоўную дынаміку скразныя героі раманнай серыі. Так, вясковае жыццё перадаецца праз бачанне рэчаіснасці настаўнікам Андрэем Мамутам, які па-ранейшаму застаецца маральным аўтарытэтам для аўтара. Мамута шмат выступаў перад аднавяскоўцамі, заклікаючы іх то падпісвацца на чарговую пазыку, то змагацца з самагоншчыкамі. Многія тэмы, як прызнаецца самому сабе герой, адышлі ў нябыт, а вось барацьба з рэлігіяй не сціхае, хоць перад Калядамі і ў хатах вяскоўцаў, і ў хаце настаўніка варыцца куцця. Асобныя эпізоды дазваляюць прасачыць дэмакратызацыю грамадскай свядомасці, напрыклад, дачка паліцэйскага, які збег з немцамі і якога ненавідзяць вяскоўцы, атрымлівае ад бацькі пісьмо з Аргенціны і запрашае гэта адзначыць. Да яе не адмаўляюцца прыйсці і вяскоўцы, і Мамута, які «думаў пра Вароніна і ў глыбіні душы не адчуваў на былога паліцэйскага злосці. А ён жа, Варонін, меў намер і яго сям’ю паставіць да сценкі, бо падазраваў у сувязях з партызанамі – Мамута сапраўды быў сувязным. Пасля вайны Прося, жонка паліцая Вароніна, прызналася Мамуце, што яна ўгаворвала мужа не чапаць настаўніка» [9, с. 60].

Аўтар працягвае жыццёвыя гісторыі шэрага скразных герояў раманнай серыі: Міхаіла Даўгалёва, Івана Сырадоева, Уладзіміра Бравусава і некаторых іншых, хоць і не адлюстроўвае дынамікі характараў, раскрывае зусім няшмат новых падзей. Знакавай трагічнай падзеяй, якая прыкметна вылучаецца ў рамане, выступае смерць Пятра Міронавіча Машэрава ў аўтакатастрофе. Вуснамі сваіх герояў пісьменнік асцярожна выказвае версію, што гэта не было няшчасным выпадкам, паслядоўна сцвярджаецца думка, што смерць такога дзеяча – гэта вялікая грамадская страта. Пісьменнік выкарыстоўвае эфект публіцыстычнага ўздзеяння на чытача, супастаўляе грамадскія праблемы і побытавую сферу. Твор «Бесядзь цячэ ў акіян» вызначаецца шматгеройнай раманнай сітуацыяй, узмацняецца хранікальнасць мастацкага аповяду. Зварот да сямейнай гісторыі, увага да жыццёвых

лёсаў аднавяскоўцаў сям'і Сахутаў спалучаецца з аўтарскай ацэнкай грамадска-палітычнага жыцця.

Глыбокая філасофская праблематыка ўласцівая раману «Палыновы вецер» (2002–2008) Леаніда Левановіча, які завяршае раманны цыкл «Шчыглы», «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа», «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян». Твор адметны найперш тым, што прысвечаны асэнсаванню Чарнобыльскай катастрофы. Так, у радыяцыйнай зоне апынулася вёска Хатынічы, дзе засталіся жыць, не захацеўшы перасяляцца, пенсіянеры: напрыклад, былы ўчастковы Бравусаў і былы настаўнік Мамута. Героі падобныя найперш агульнасцю лёсаў: яны асэнсоўваюць мінулае і новыя акалічнасці, як прыродныя, так і сацыяльныя, разумеюць, што пасля вайны напалову спаленая вёска адрадзілася, а пасля Чарнобыля, на жаль, не ўваскрэсне. Экалагічная катастрофа ў нейкай меры выступае іншасказальным увасабленнем грамадска-сацыяльных змен, над якімі аўтар разважае разам з чытачом. Значная мастацкая ўвага нададзена вобразу партыйнага чыноўніка, як гаворыць аўтар, партыйнага функцыянера – Андрэя Сахуты, сакратара абкама партыі па ідэалогіі. Вачыма свайго героя аўтар паказвае, наколькі партыя адышла ад народнага жыцця, стала своеасаблівай сістэмай у дзяржаўнай сістэме, сродкам кар'ернага росту для карыслівых людзей. Пасля распаду Савецкага Саюза Андрэй Сахута, як і многія іншыя чыноўнікі, застаецца без працы, таму вяртаецца на малую радзіму – у радыяцыйную зону, працуе ў лясніцтве, тады як усе іншыя імкнуцца пакінуць небяспечны для здароўя край. Нездарма аб рамане «Палыновы вецер» А.У. Рагуля зазначае, што твор «з'яўляецца своеасаблівым разгорнутым сімвалам – падсумаваннем вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва, сэнс якога А. Платонаў азначыў канцэптам ***катлаван*** у сваім аднайменным рамане» [3, с. 566]. Думаецца, ***катлаван*** выступае не столькі канцэптам, колькі метафарай, шматсэнсоўнасць якой раскрываецца на філасофскім узроўні твора. Як працягвае даследчык, у «Палыновым ветры» Л. Левановіч «часта звяртаецца да рэтраспектыўнага паказу сацыяльнай і духоўнай рэальнасці на пачатку вялікага сацыяльнага эксперыменту, калі толькі рыхтаваўся катлаван пад фундамент сталінскага сацыялізму. Даўно пражытае вяртаецца аўтарам у кантэкст актуальнага часу, становіцца аб'ектам рэфлексіі. Гэтым самым у творы рэабілітуецца сучаснасць, занядбаная дзеля "светлай" будучыні, аднаўляецца плынь гісторыі» [3, с. 566]. Леанід Левановіч сцвярджае, што ні грамадская, ні тэхнагенная катастрофа не можа адарваць чалавека ад яго малой радзімы, з якой пачынаецца Радзіма ў цэлым.

**Заключэнне.** Такім чынам, пісьменнік раскрывае сямейную гісторыю на працягу значнага адрэзку часу, увасабляе аўтабіяграфічны вобраз скразнога персанажа, шырока выкарыстоўвае традыцыю сямейнай хронікі. Аповед, хоць найчасцей і вядзецца ад трэцяй асобы, у гэтым выпадку блізкі «Я»-апавядальнай стратэгіі, якая дазваляе актуалізаваць розныя сродкі мастацкага псіхалагізму. У выніку асоба галоўнага героя бачыцца перакanaўчай і па-свойму прывабнай, адметна паказваецца і сям'я Сахутаў. Разам з тым іншыя скразныя героі раманнай серыі пазбаўлены псіхалагічнай дынамікі, для іх увасаблення выбрана стратэгія пераважна рэкамендацыі чытачу.

На працягу раманнай серыі аўтар па-мастацку даследуе сацыяльны і грамадска-палітычны кантэкст, якому з кожным наступным творам надае ўсё большую ідэйную значнасць. У раманную серыю Леаніда Левановіча ўваходзяць мастацкія палотны, розныя паводле сваёй жанравай разнавіднасці. Твор «Шчыглы» блізкі да рамана-ўспаміну, «Паводка сярод зімы» – да сямейнай хронікі з элементамі вясковай прозы, «Дзікая ружа», «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян» адпавядаюць сацыяльна-палітычнай прозе з элементамі сямейнай хронікі, «Палыновы вецер» варта назваць філасофскім раманам. Як бачым, у творчасці пісьменніка цыклізацыя рамана не выступае паўнавартаснай эстэтычнай з'явай, перавага аддаецца найперш раманнай серыі, якая дазваляе мастаку слова вар'іраваць тэмы і праблемы.

## Літаратура


1. Корань, Л. Цукровы пеўнік: літ.-крыт. арт. / Л. Корань. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 286 с.
2. Бензярук, Р. Летапісец Прыбяседдзя / Р. Бензярук // ЛіМ. – 2018. – 2 лістап. – С. 9.
3. Рагуля, А.У. Леанід Левановіч / А.У. Рагуля // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр дасслед. беларус. культуры мовы і літ.; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 544–571.
4. Левановіч, Л. Шчыглы: раман [пачатак] / Л. Левановіч // Маладосць. – 1986. – № 8. – С. 11–81.
5. Левановіч, Л. Шчыглы: раман [працяг] / Л. Левановіч // Маладосць. – 1986. – № 9. – С. 59–102.
6. Левановіч, Л. Паводка сярод зімы: раман, апавяданні / Л. Левановіч. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 397 с.
7. Левановіч, Л. Дзікая ружа: раман, аповесць, апавяданне / Л. Левановіч. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 335 с.
8. Левановіч, Л. Сіняе лета: раман, аповесці, эсэ / Л. Левановіч. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 358 с.
9. Левановіч, Л. Бесядзь цячэ ў акіян: раман / Л. Левановіч // Полымя. – 2003. – № 3. – С. 11–74.


*Паступіў у рэдакцыю 11.01.2019 г.*